ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА



# Узаемная зацікаўленасць

18.01.2018 10:59 Актуальна, Апошнія запісы без каментарыяў

**Міністр адукацыі І.В.Карпенка і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арабскай Рэспублікі Егіпет у Расійскай Федэрацыі Іхаб Ахмед Талаат Насар, які выконвае дыпламатычную місію па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь, сустрэліся ў Міністэрстве адукацыі. Іхаб Ахмед Талаат Насар прыбыў у Мінск з нагоды ўручэння даверчай граматы прэзідэнту нашай краіны і наведвання міністэрстваў і ведамстваў Беларусі, у тым ліку Міністэрства адукацыі.**



Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары. Ok Падрабязней.

праявіў да адукацыйнай галіны ў Беларусі і тым самым выказаў намер сваёй краіны наладжваць цеснае супрацоўніцтва з Беларуссю ў гэтай сферы.

— Нядаўні візіт кіраўніка нашай дзяржавы ў краіны арабскага свету стварыў новую платформу для нарошчвання сяброўскіх і дзелавых сувязей, у тым ліку ў сферы адукацыі, — адзначыў І.В.Карпенка. — Таму ў развіцці тых палітычных і эканамічных дамоўленасцей, якія былі дасягнуты на самым высокім узроўні, мы прыкладваем сілы, каб нашы адносіны ў сферы адукацыі развіваліся больш інтэнсіўна і выходзілі на новы ўзровень.

Для развіцця супрацоўніцтва паміж краінамі існуе міжурадавае пагадненне. Для таго каб яно паўнавартасна працавала ў плоскасці канкрэтных праектаў, Міністэрства адукацыі распрацавала на найбліжэйшыя гады праграму супрацоўніцтва паміж урадамі дзвюх краін у сферы вышэйшай адукацыі. Таксама, улічваючы, што Міністэрства адукацыі Беларусі вядзе пытанні маладзёжнай палітыкі, быў падрыхтаваны праект мемарандума аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам моладзі і спорту Арабскай Рэспублікі Егіпет па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне маладзёжнай палітыкі.

І.В.Карпенка засяродзіў увагу на ўзаемадзеянні паміж краінамі ў галіне дрэваапрацоўкі і падрыхтоўкі кадраў для гэтай сферы. Справа ў тым, што прадстаўнікі канцэрна “Беллесбумпрам” і БДТУ пабывалі ў Егіпце, дзе прадэманстравалі магчымасці айчыннай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў у дрэваапрацоўчай прамысловасці. Па выніках гэтага візіту егіпецкім бокам было прынята рашэнне накіраваць сваіх спецыялістаў у нашу краіну для прафесійнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі ў галіне дрэваапрацоўкі і вытворчасці мэблі на базе БДТУ. У адпаведнасці з запытамі егіпецкага боку, у тэхналагічным універсітэце падрыхтаваны праграмы курсаў на англійскай мове па тэматыцы ў галіне дызайну, праектавання мэблі і лічбавага праграмнага кіравання абсталяваннем для вытворчасці мэблі. Працягласць курсаў — некалькі тыдняў.

Варта адзначыць і супрацоўніцтва паміж Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам і Табінскім металургічным інстытутам, якое накіравана на стварэнне сумеснага інжынернага факультэта.

І.В.Карпенка адзначыў, што апошнім часам істотна актывізаваліся міжуніверсітэцкія сувязі паміж краінамі, што дазволіла выйсці на падпісанне канкрэтных дагавораў паміж УВА. На сёння заключана ўжо 8 такіх дамоўленасцей. Вельмі важным напрамкам міністр адукацыі лічыць развіццё экспарту адукацыйных паслуг, што вядзе да павелічэння колькасці егіпецкіх грамадзян, якія гатовы вучыцца ў

беларускіх установах вышэйшай адукацыі. Сёння гэты працэс мае станоўчую дынаміку.

У працяг размовы пасол Арабскай Рэспублікі Егіпет, па сутнасці, развіў тыя ж самыя кірункі, пра якія расказаў кіраўнік Міністэрства адукацыі Беларусі, і тым самым пацвердзіў, што абедзве краіны зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва. Так, у прыватнасці, пасол звярнуў увагу на павелічэнне колькасці міжуніверсітэцкіх дагавораў, ахоп іншых універсітэтаў і іншых спецыяльнасцей, на пашырэнне падрыхтоўкі навуковых кадраў у аспірантуры, наладжванне абмену студэнтамі і выкладчыкамі, развіццё сумеснай навукова-даследчай дзейнасці. Ігар Васільевіч Карпенка адзначыў, што ў нашай краіне гэтая работа вядзецца па многіх кірунках, і кожны з іх будзе цікавы для егіпецкіх калег, таму што беларускім бокам тут дасягнуты даволі высокія вынікі. Гэта інжынерыя, медыцына, IT, сельская гаспадарка і шэраг іншых сфер. Для развіцця навуковых даследаванняў у вышэйшай школе створаны тэхнапаркі, лабараторыі і іншыя структуры, дзе можна займацца даследчай дзейнасцю.

Напрыканцы размовы Ігар Васільевіч Карпенка папрасіў перадаць запрашэнне наведаць Беларусь кіраўніку Міністэрства вышэйшай адукацыі і навуковых даследаванняў Арабскай Рэспублікі Егіпет.

**Ала КЛЮЙКО.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

1

Егіпет | Ігар Васільевіч Карпенка | Іхаб Ахмед Талаат Насар | міністр адукацыі | міністэрства адукацыі | пасол

## Падобныя навіны



**Краіна стане яшчэ больш прыгожай...**

24.04.2018



**Удасканальваць здабытае, прыўносіць нова...**

14.04.2018



**Умацаванне адносін...**

05.04.2018

**Карпаратыўная сустрэча...**

 03.04.2018

### Пакінуць каментарый

Ваш электронны адрас не будзе апублікаваны. Абавязковыя палі пазначаны *

Каментарый *

Імя *

E-mail *

I'm not a robot

reCAPTCHA

Privacy - Terms

Дадаць каментарый

Пошук

Папулярныя публікацыі



**Образовательные новации — 2018**

Под таким названием на сайте БелТА прошла онлайн-конференция министра образования Республики Беларусь Игоря Васильевича Карпенко Министр...

**Пралеска Іўеўшчыны**



У конкурсе прыгажосці “Міс Вясна — 2018” узялі ўдзел сем дзяўчат з розных куткоў Іўеўскага...



**Вершы пра родны край**

“Паэзія — цудоўная старонка, для нас сёння адкрывае дзверы” — пад такім дэвізам у дашкольным...



**Дастойная прафесія для мужчын**

Я настаўнік пачатковых класаў Навабыхаўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы, і мой агульны педагагічны стаж...



**Выхаванне творчасцю**

Для мяне заўсёды было загадкай, як жанчыне-педагогу, у якой ёсць свая сям’я, дзеці і іншыя...

juniorskills | worldskills
Belarus

## Інфармацыйная гадзіна

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА: “Галоўная мэта застаецца нязменнай — мы будуем дзяржаву для народа”**

Вытрымкі з Паслання Прэзідэнта Беларусі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Бяспека краіны — у еднасці народа,...

**Выбраны новы кіраўнік дзяржавы**

Мігель Дыяс-Канель выбраны на пасаду старшыні Дзяржаўнага савета Кубы, паведамляюць інфармагенцтвы. На гэтай пасадзе ён змяніў...

**Гарантаванне бяспекі — галоўны клопат**

Гарантаванне бяспекі і паляпшэнне работы пунктаў пропуску застаецца актуальнай тэмай для трохбаковай кантактнай групы. Аб

**Ад прафесіяналізму журналістаў залежыць прафесійная рэпутацыя**

Міжнароднае супрацоўніцтва інфармагенцтваў ва ўмовах сучасных выклікаў павінна ўмацоўвацца. Такое меркаванне выказаў першы намеснік генеральнага

**Прыклад для іншых краін па развіцці ўзаемавыгадных кантактаў**

Адносіны Беларусі з Азербайджанам развіваюцца вельмі энергічна і пры вялікай шчырай зацікаўленасці кіраўнікоў дзвюх дзяржаў

## Каментарыі

- Admin к записи Валянцінка Радзіме
- Admin к записи Валянцінка Радзіме
- Марына к записи Валянцінка Радзіме

- МАрына к записи Валянцінка Радзіме
- Вольга Пятроўна к записи Некалькі візітовак для Магілёва


НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.rakurs.ng-press.by САЦЫЯЛЬНЫ РАКУРС
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.raj.ng-press.by РЭЙ
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.hatka.ng-press.by Утульная ХАТКА
НАШЫ ДЗЕЦІ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ДАБРАЧЫННАЯ АКЦЫЯ
Увага! Прамая лінія!
ПРЭС-ТУР
НОВЫ ПРАЕКТ ШКОЛА — ДЛЯ БАЦЬКОЎ
Родная зямля Да 70-годдзя вызвалення Беларусі
Вядомыя асобы Беларусі ў праекце МАЯ ШКОЛА


## Творчыя праекты


ЗВОНКАЯ РАНІЦА сайт конкурсу юных вакалістаў
маладзёжны ПРЭС-КЛУБ сайт падтрымкі самадзейных СМІ і юных журналістаў


## Нашы сябры


"ЗУБРЁНОК" Национальный детский образовательно-оздоровительный центр
ПАРТАЛ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРЭСЫ установы «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета»


## Інтэрнэт-рэсурсы


Президент Республики Беларусь www.president.gov.by
Министерство образования Республики Беларусь
Министерство информации Республики Беларусь
ЭЛЕКТРОННАЯ ПАДПІСКА на «Настаўніцкую газету» расчет


## Нашы дадаткі


НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.portfolio.ng-press.by ПАРТФОЛІА
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.abituryent.ng-press.by АБІТУРЫЕНТ
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.6day.ng-press.by ШОСТЫ ДЗЕНЬ
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.prastora.ng-press.by АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА
НАСТАЎНІЦКАЯ газета www.forum.ng-press.by ФОРУМ


## Статыстыка


1 913
488
57
118
51
47
tibo ИНТЕРНЕТ-ПРЕМИЯ

©2014-2018 Сайт газеты "Настаўніцкая газета"